# Стратэгія Дэмакратычных Сіл Беларусі 2026+

Для публічнага абмеркавання



СВЯТЛАНА ЦІХАНОЎСКАЯ
ОФІС

# Змест


Уводзіны 3
Хто мы і як уладкаваны 4
Нашы каштоўнасці 5
Бачанне Новай Беларусі 6
Дзе мы цяпер 7
Сцэнары перамен 8
Стратэгічныя мэты 2026+ 10
Рэсурсы і ўстойлівасць 13
Як вымяраем поспех 14
Чаму гэта датычыцца кожнага 15

# Уводзіны

### Навошта патрэбна адзіная Стратэгія?

Каб аб'яднаць намаганні дзеля дасягнення агульнай мэты і задаць агульны курс «тут і цяпер»: як крок за крокам ісці ад дыктатуры да дэмакратыі.

### Для каго гэты дакумент?

Для ўсіх, хто хоча перамен: для ініцыятыў і медыя, для палітычных каманд і арганізацый грамадзянскай супольнасці, для беларусаў у краіне і па-за яе межамі. Тэкст наўмысна просты, каб кожны зразумеў, дзе яго ўнёсак будзе карысным.

### Што ўнутры?

Кароткае апісанне таго, хто мы і як уладкаваны; нашы каштоўнасці; бачанне Новай Беларусі; цвярозая карціна «дзе мы цяпер»; магчымыя сцэнары перамен; шэсць стратэгічных мэтаў з логікай дзеянняў і вымярэннямі поспеху; пра рэсурсы і ўстойлівасць.

### Як гэтым карыстацца?

Адкрыйце патрэбны раздзел, паглядзіце мэту і тлумачэнні, абярыце крокі, якія даступныя менавіта вам.

Гэтая Стратэгія дае агульную рамку і напрамкі дзеянняў. Яна дапамагае каардынавацца, гаварыць адной зразумелай мовай і паслядоўна рухацца да дэмакратычнай Беларусі. Яе задача — не толькі растлумачыць агульны курс, але і паказаць кожнаму, дзе менавіта ён можа стаць часткай перамен.

# Хто мы і як уладкаваны

Наша місія — пабудаваць дэмакратычную Беларусь, дзе дзейнічае закон, улада вызначаецца сумленнымі выбарамі, а годнасць чалавека з'яўляецца нормай.

**Хто мы?**

Мы — беларусы, якія не згодныя жыць у дыктатуры і хочуць бачыць сваю краіну свабоднай, незалежнай і справядлівай. Гэта людзі, ініцыятывы, арганізацыі, палітычныя каманды, грамадзянская супольнасць, незалежныя медыя, дыяспары і ўсе, хто працуе дзеля перамен.

**Што нас аб'ядноўвае?**

Нас аб'ядноўваюць агульныя прынцыпы: свабода, правы чалавека, сумленныя выбары, вяршэнства права, незалежнасць Беларусі і яе еўрапейская будучыня. Беларуская культура і мова дапамагаюць захоўваць нашу сувязь адзін з адным і пачуццё агульнай прыналежнасці.

**Як мы ўладкаваны?**

Дэмакратычныя сілы — гэта не адна структура і не адна група людзей, а шырокі рух, у якім у розных частак свая роля.

Святлана Ціханоўская, Офіс Святланы Ціханоўскай і Аб'яднаны пераходны кабінет дапамагаюць прадстаўляць дэмакратычную Беларусь на міжнародным узроўні, утрымліваць увагу да нашай краіны і каардынаваць агульныя намаганні.

Каардынацыйная рада, палітычныя партыі і іншыя палітычныя структуры дапамагаюць прадстаўляць розныя погляды, абмяркоўваць агульныя рашэнні і рыхтаваць аснову для будучай сумленнай палітыкі ў Новай Беларусі.

Грамадзянская супольнасць, грамадскія ініцыятывы, незалежныя медыя, прафсаюзы дапамагаюць людзям, абараняюць правы, падтрымліваюць салідарнасць і робяць дэмакратычны рух прыкметным у паўсядзённым жыцці.

Дыяспары і Народныя амбасады падтрымліваюць беларусаў за мяжой, расказваюць свету праўду пра Беларусь, дапамагаюць захоўваць міжнародныя сувязі і ўцягваць усё больш людзей у агульную справу.

**Як мы ўзаемадзейнічаем?**

Праз супрацоўніцтва, гарызантальныя сувязі і сумесныя дзеянні там, дзе гэта патрэбна для агульнага выніку.

Наш рух адкрыты для ўсіх, хто гатовы працаваць дзеля дэмакратычных перамен у Беларусі. Адрозненні ў поглядах, стаўленні да асобных структур або фарматаў удзелу не адмяняюць галоўнага: імкнення вярнуць краіне свабоду, закон і права людзей самім вызначаць сваю будучыню.

# Нашы каштоўнасці

Нашы каштоўнасці — гэта тое, на чым трымаецца наша барацьба і на чым будзе будавацца Новая Беларусь.

**Незалежнасць.**
Беларусь сама вырашае свой лёс. Мы не дазволім нікому пазбаўляць нашу краіну права на ўласны голас, уласны шлях і ўласную будучыню.

**Свабода.**
Чалавек мае права гаварыць праўду, рабіць выбар, аб'ядноўвацца з іншымі і не жыць у страху.

**Годнасць.**
Кожны чалавек заслугоўвае павагі. Дзяржава існуе для чалавека, а не чалавек для дзяржавы.

**Справядлівасць і права.**
Закон павінен абараняць, а не караць. Ніхто не можа быць вышэй за закон. За гвалт, хлусню і злоўжыванне ўладай павінна надыходзіць адказнасць.

**Дэмакратыя.**
Улада павінна абірацца народам, быць падсправаздачнай грамадству і мірна змяняцца праз выбары.

**Беларусская ідэнтычнасць.**
Беларусь — гэта наша гісторыя, мова, культура, памяць і сімвалы. Мы хочам быць сабой і мець дзяржаву, якая паважае і развівае беларусскую самабытнасць.

**Салідарнасць.**
Мы розныя, але нас аб'ядноўвае адказнасць за краіну і павага адзін да аднаго. Мы верым ва ўзаемную падтрымку, удзел і сілу грамадства.

# Бачанне Новай Беларусі

Новая Беларусь — гэта свабодная еўрапейская краіна, дзе ўлада служыць людзям, закон працуе, а будучыня не выклікае страху.

Гэта краіна, дзе не саджаюць за меркаванне, дзе ўлада фарміруецца праз сумленныя выбары, дзе суд абараняе, а не выконвае загад, дзе можна сумленна працаваць, будаваць сям'ю, адкрываць справу, гаварыць на роднай мове і не баяцца заўтрашняга дня.

**Новая Беларусь — гэта дзяржава, якой давяраюць.**

Улада дзейнічае адкрыта і ў інтарэсах грамадства. Чыноўнікі адказваюць за свае рашэнні. Карупцыя, самавольства і беспакаранасць перастаюць быць нормай.

**Новая Беларусь — гэта жывая дэмакратыя.**

Грамадзяне ўдзельнічаюць у кіраванні краінай. Партыі, медыя, прафсаюзы і грамадскія ініцыятывы працуюць свабодна. Меркаванне людзей уплывае на рашэнні, а не ігнаруецца.

**Новая Беларусь — гэта краіна магчымасцяў.**

Тут можна вучыцца, працаваць, ствараць, інвеставаць і развіваць сваю справу без страху страціць усё з-за самавольства. Эканоміка працуе па зразумелых правілах. Прыватная ўласнасць абароненая. Праца паважаецца.

**Новая Беларусь — гэта дзяржава, якая ўкладвае ў чалавека.**

Якасная адукацыя, даступная медыцына, сучасная сацыяльная абарона і падтрымка сем'яў становяцца нормай, а не прывілеем.

**Новая Беларусь — гэта краіна, якая паважае сябе.**

Беларуская мова, культура, гісторыя і сімвалы займаюць годнае месца ў грамадскім жыцці. Мы беражом сваё і пры гэтым застаёмся адкрытымі да свету.

**Новая Беларусь — гэта частка Еўропы.**

Наш шлях — да еўрапейскіх стандартаў права, кіравання, бяспекі і якасці жыцця. Мы бачым Беларусь часткай еўрапейскай прасторы свабоды і супрацоўніцтва.

**Новая Беларусь будуецца ўжо цяпер.**

Яна пачынаецца з нашай салідарнасці, з нашай адказнасці, з нашага ўдзелу ў пераменах. Яна пачынаецца там, дзе людзі перастаюць чакаць чужога рашэння і бяруць на сябе сваю частку агульнай працы. Будучыня краіны залежыць не ад аднаго лідара, а ад гатоўнасці грамадства дзейнічаць разам. Чым мацнейшая наша гатоўнасць дзейнічаць разам сёння, тым бліжэй свабодная Беларусь заўтра.

# Дзе мы цяпер

Пасля 2020 года беларусы жывуць ва ўмовах рэпрэсій, страху і зацяжной стомленасці. Але грамадства не знікла і не здалося. Людзі сталі больш асцярожнымі, часцей выбіраюць бяспечныя формы дзеяння, трымаюцца на салідарнасці і ўзаемадапамозе. Прыватны сектар, які доўга быў важнай крыніцай ініцыятывы і самастойнасці, перажыў ціск і рэлакацыі, і яго магчымасці прыкметна скараціліся. Гэта ўдарыла і па даходах сем'яў, і па пачуцці ўпэўненасці ў будучыні.

Вайна рэзка ўзмацніла ўразлівасць Беларусі і яшчэ глыбей уцягнула краіну ў залежнасць ад Расіі. Рэжым даў тэрыторыю Беларусі для расійскай агрэсіі супраць Украіны, тым самым паставіўшы пад удар суверэнітэт і бяспеку краіны. Таму незалежнасць Беларусі сёння — гэта не абстрактная ідэя, а пытанне бяспекі і будучыні кожнага. Пры гэтым беларусы не прынялі гэтую вайну як сваю: людзі выходзілі на антываенныя акцыі, сабатавалі вайсковую лагістыку, а беларускія добраахвотнікі сталі на абарону свабоды Украіны і Беларусі.

Адначасова змяніўся і сам дэмакратычны рух. Стыхійны пратэст змяніўся больш устойлівымі палітычнымі і грамадскімі структурамі, якія дзейнічаюць унутры краіны і па-за яе межамі. Рух стаў больш сталым, але разам з гэтым вырас і запыт на ўзгодненасць, ясныя ролі і бачныя вынікі. Вакол Святланы Ціханоўскай захоўваецца цэнтр палітычнага прадстаўніцтва, а па-за межамі краіны ўмацавалася сетка падтрымкі: дыяспары, Народныя амбасады, арганізацыі грамадзянскай супольнасці, сумесныя кампаніі і міжнародныя партнёрствы. Дзякуючы гэтаму Беларусь не знікла з міжнароднага парадку дня, а дэмакратычныя сілы захоўваюць голас і прастору для дзеяння.

Унутры краіны прастора для адкрытай актыўнасці застаецца надзвычай вузкай. Рэпрэсіі працягваюцца, кантроль над інфармацыяй узмацняецца, а рызыка пакарання закранае ўсё новыя групы. З-за гэтага людзі радзей дзейнічаюць публічна, але гэта не азначае знікнення энергіі або волі да перамен. Яна захоўваецца, проста часцей выяўляецца ў менш прыкметных і больш бяспечных формах.

Сёння асабліва важнае пытанне даверу. Людзі чакаюць ад дэмакратычных сіл не толькі правільных слоў, але і ўзгодненасці, адказнасці і адчувальных вынікаў. Менавіта таму адзінства дзеянняў становіцца не менш важным, чым самі ідэі.

Цяперашняя сітуацыя складаная, але не безнадзейная. Беларусь застаецца пад ціскам рэпрэсій, міжнароднай ізаляцыі рэжыму і нарастаючай залежнасці ад Расіі. І ўсё ж ідэя Новай Беларусі не знікла. Яна трымаецца на ўпартасці людзей, на салідарнасці, на інстытутах дэмакратычнага руху і на падтрымцы тых, хто працягвае змагацца за свабоду краіны. Мы вучымся жыць у гэтых умовах, захоўваць сябе, падтрымліваць адзін аднаго і рыхтаваць будучыню, у якой Беларусь зноў стане свабоднай і незалежнай.

# Сцэнары перамен

Пераход ад дыктатуры да дэмакратыі можа пачацца па-рознаму. У рэальным жыцці перамены рэдка ідуць па адным загадзя зразумелым шляху. Часцей за ўсё супадаюць адразу некалькі фактараў: унутраны крызіс, ціск грамадства, раскол унутры сістэмы, аслабленне падтрымкі з боку Расіі і знешні ціск.

Таму наша задача — не чакаць «ідэальнага сцэнару», а быць гатовымі да розных варыянтаў развіцця падзей і набліжаць дэмакратычныя перамены ўжо цяпер. Для гэтага трэба ўзмацняць устойлівасць грамадства, умацоўваць міжнародныя пазіцыі дэмакратычных сіл і дамагацца таго, каб беларусы самі ўдзельнічалі ў вырашэнні лёсу сваёй краіны. Наш прынцып: ніякіх дамоўленасцяў пра Беларусь без беларусаў.

### ПЕРАМОЎНЫ ПЕРАХОД ПАД ЦІСКАМ

Гэты сцэнар прадугледжвае, што рэжым вымушаны ісці на перамовы аб перадачы ўлады і выхадзе з крызісу. Такое магчыма, калі ён аслабне праз унутраны крызіс, знешні ціск, раскол эліт і зніжэнне падтрымкі з боку Расіі, але пры гэтым захаваецца прастора для палітычных дамоўленасцяў. У такім выпадку перамовы могуць адкрыць шлях да вызвалення палітвязняў, запуску пераходных органаў, гарантый бяспекі, змены правілаў і падрыхтоўкі свабодных выбараў.

### ПЕРАХОД ПРАЗ ГРАМАДЗЯНСКУЮ МАБІЛІЗАЦЫЮ

Гэта сцэнар паўстання, рэвалюцыйнага ўздыму або маштабнага ўнутранага зрыву сістэмы. Тут вырашальным фактарам становяцца масавы грамадскі ціск, страйкі, пратэсты, сабатаж, крызіс кіравання і адмова часткі эліт і сілавых структур падтрымліваць уладу. У такім сцэнары стары парадак пачынае разбурацца не таму, што бакі дамовіліся, а таму, што рэжым губляе здольнасць утрымліваць краіну ў ранейшым выглядзе. Тут асабліва важныя грамадзяне, працоўныя калектывы, незалежныя ініцыятывы і здольнасць грамадства да самаарганізацыі.

### ПАСТУПОВАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ СІСТЭМЫ

Гэта сцэнар, пры якім змены пачынаюцца зверху — па ініцыятыве часткі самой кіроўнай эліты. Прычынай можа стаць сыход лідара, барацьба ўнутры наменклатуры або спроба выратаваць сістэму праз яе частковую перабудову. У такім выпадку ўлада можа пайсці на абмежаваныя рэформы, пераразмеркаванне паўнамоцтваў і асцярожнае адкрыццё палітычнай прасторы, каб знізіць напружанне і вывесці краіну з тупіка. Такі шлях сам па сабе не гарантуе дэмакратыю, але можа адкрыць акно для больш глыбокіх перамен.

### ПЕРАМЕНЫ ПАД ПРАМЫМ ЗНЕШНІМ ЦІСКАМ

Гэта крайні сцэнар, пры якім рэжым уцягвае Беларусь у больш шырокі ваенны канфлікт на баку Расіі і церпіць паразу разам з ёй. У такім выпадку перамены адбываюцца пад моцным знешнім уздзеяннем як вынік ваеннай паразы, міжнароднага прымусу і знешняга кантролю над пераходам. Гэта самы цяжкі і балючы сцэнар. Але нават у такім выпадку будучыня Беларусі не павінна вырашацца без беларусаў.

### ЗАЦЯГВАННЕ ПЕРАХОДУ

Пераход можа і не пачацца хутка. Рэжым можа захоўваць кантроль за кошт рэпрэсій, прапаганды і нарастаючай залежнасці ад Расіі. Гэта не азначае, што перамены немагчымыя. Гэта азначае, што шлях да іх будзе даўжэйшы, цяжэйшы і даражэйшы для краіны.

Ва ўсіх сцэнарах галоўнае пытанне адно: ці змогуць дэмакратычныя сілы заставацца арганізаванай, прызнанай і дзеяздольнай сілай, якая ўдзельнічае ў вызначэнні будучыні Беларусі. Менавіта таму трэба рыхтавацца не да аднаго «правільнага» варыянту, а да розных траекторый перамен — і пры любых абставінах захоўваць здольнасць дзейнічаць.

# Стратэгічныя мэты 2026+

### СТРАТЭГІЧНАЯ МЭТА 1. УЗМАЦНІЦЬ ПАДТРЫМКУ БЕЛАРУСАЎ, ЯКІЯ ПАЦЯРПЕЛІ АД РЭПРЭСІЙ, САДЗЕЙНІЧАЮЧЫ ВЫЗВАЛЕННЮ ПАЛІТЫЧНЫХ ЗНЯВОЛЕНЫХ, РЭАБІЛІТАЦЫІ І АДНАЎЛЕННЮ ПРАВОЎ АХВЯР РЭЖЫМУ.

Дэмакратычныя сілы садзейнічаюць вызваленню палітычных зняволеных, працуюць над спыненнем палітычна матываваных пераследаў, забяспечваюць сістэмную дапамогу пацярпелым і іх сем'ям, а таксама дамагаюцца рэабілітацыі, аднаўлення правоў і годнасці ахвяр рэпрэсій.

Важнай часткай гэтай працы застаецца дакументаванне рэпрэсій: фіксацыя затрыманняў, судоў, сведчанняў і іншых фактаў, каб захоўваць праўду пра кожную справу, падтрымліваць міжнародную адвакатыю і рыхтаваць аснову для будучай справядлівасці.

Асобны напрамак гэтай мэты — падтрымка беларусаў за мяжой, уключаючы пытанні легалізацыі, дакументаў, доступу да сацыяльнай і прававой дапамогі, а таксама рашэнні, звязаныя з навучаннем, працаўладкаваннем і паўсядзённай інтэграцыяй.

Паралельна рыхтуюцца механізмы кампенсацыі шкоды, рэабілітацыі і змяненняў у пенітэнцыярнай сістэме, каб пасля перамен аднаўленне правоў не пачыналася з нуля.

### СТРАТЭГІЧНАЯ МЭТА 2. ПАШЫРЫЦЬ УДЗЕЛ БЕЛАРУСАЎ У ДЭМАКРАТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ, КАБ УСЁ БОЛЬШ ЛЮДЗЕЙ МАГЛІ ЎПЛЫВАЦЬ НА БУДУЧЫНЮ КРАІНЫ, АБ'ЯДНОЎВАЦЦА І ДЗЕЙНІЧАЦЬ СУПОЛЬНА.

Дэмакратычныя сілы ствараюць рэальныя, даступныя і бяспечныя магчымасці для ўдзелу беларусаў у грамадскім і палітычным жыцці, умацоўваюць гарызантальныя сувязі, уцягваюць новыя групы і падтрымліваюць практыкі салідарнасці, каб усё больш беларусаў былі не аб'ектамі палітыкі, а яе актыўнымі ўдзельнікамі.

Асаблівае значэнне маюць бяспечныя формы грамадзянскага дзеяння ўнутры Беларусі: лакальныя супольнасці, ініцыятывы ўзаемадапамогі, аўтаномныя групы і іншыя фарматы, якія дазваляюць захоўваць грамадскую актыўнасць нават ва ўмовах рэпрэсій і абмежаванняў на афлайн-удзел.

Гэтую мэту ўзмацняе і праца з беларусамі за мяжой праз дыяспары, грамадскія сеткі і ініцыятывы, якія дапамагаюць падтрымліваць уцягнутасць, падтрымліваць сувязі з краінай і ўключаць усё больш людзей у дэмакратычную практыку.

Пашырэнне ўдзелу павінна суправаджацца зразумелай камунікацыяй, якая звязвае каштоўнасці дэмакратычных перамен з паўсядзённым досведам людзей і робіць удзел даступным не толькі для перакананых прыхільнікаў, але і для больш шырокага кола беларусаў.

### СТРАТЭГІЧНАЯ МЭТА 3. УМАЦАВАЦЬ ІНФАРМАЦЫЙНУЮ І КУЛЬТУРНУЮ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА ЯК АСНОВУ СВАБОДЫ, АДЗІНСТВА І НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСІ.

Дэмакратычныя сілы садзейнічаюць развіццю незалежных медыя, крытычнага мыслення, бяспечнай камунікацыі і здольнасці людзей распазнаваць прапаганду і маніпуляцыі, а таксама падтрымліваюць беларускую культуру, мову і ідэнтычнасць як важную аснову грамадскай сувязі і будучыні свабоднай Беларусі.

Інфармацыйная ўстойлівасць азначае, што ў людзей павінен захоўвацца доступ да праўдзівай інфармацыі і бяспечных каналаў зносін. Для гэтага важная прысутнасць

незалежных беларускіх галасоў у ключавых лічбавых прасторах, развіццё дадатковых і рэзервовых каналаў распаўсюджвання інфармацыі, а таксама стварэнне зразумелых і блізкіх людзям фарматаў, якія дапамагаюць адрозніваць факты ад фэйкаў і падменаў. Важнай часткай гэтай працы застаецца і абарона добрасумленнага кантэнту на лічбавых платформах.

Культурная ўстойлівасць азначае захаванне жывога беларускага асяроддзя — мовы, памяці, сімвалаў, культуры і прасторы агульнай прыналежнасці. Таму дэмакратычныя сілы развіваюць культурныя і адукацыйныя праекты, падтрымліваюць хабы, фестывалі, выставы, рэзідэнцыі, медыйныя і асветніцкія ініцыятывы, каб беларуская культура заставалася даступнай, прыкметнай і аб'ядноўчай як унутры краіны, так і па-за яе межамі.

Гэтая мэта патрэбная не толькі для абароны грамадства ад дэзінфармацыі, але і для ўмацавання пачуцця супольнасці, даверу адзін да аднаго і ўпэўненасці ў будучыні ўласнай краіны.

## СТРАТЭГІЧНАЯ МЭТА 4. АСЛАБІЦЬ ПАЗІЦЫІ АЎТАРЫТАРНАГА РЭЖЫМУ І ЎМАЦАВАЦЬ ГОЛАС ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ І БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА ТАМ, ДЗЕ ВЫРАШАЕЦЦА БУДУЧЫНЯ БЕЛАРУСІ.

Дэмакратычныя сілы працуюць над тым, каб рэжым не мог безальтэрнатыўна гаварыць ад імя Беларусі, і каб дэмакратычныя прадстаўнікі і самі беларусы былі пачутыя на міжнародных пляцоўках, у палітычным дыялогу і ў экспертным асяроддзі. Гаворка ідзе не толькі пра міжнародную прысутнасць, але і пра права беларусаў удзельнічаць у вырашэнні лёсу сваёй краіны.

Для гэтага дэмакратычныя сілы дамагаюцца міжнароднай адказнасці за рэпрэсіі, падтрымліваюць збор і перадачу доказаў у міжнародныя і еўрапейскія прававыя механізмы, садзейнічаюць санкцыям, якія сапраўды абмяжоўваюць магчымасці рэжыму, яго атачэння і тых, хто падтрымлівае гвалт.

Асобная задача — праца з тымі, хто сёння знаходзіцца ўнутры сістэмы. Важна загадзя пазначаць умовы адказнасці, пераходнай справядлівасці, магчымай амністыі і ўдзелу ў будучыні краіны для тых, хто адмаўляецца ад падтрымкі рэпрэсій і гатовы дзейнічаць у межах закона.

Адначасова дэмакратычныя сілы развіваюць устойлівы дыялог з дзяржавамі, парламентамі, міжнароднымі арганізацыямі і грамадзянскімі структурамі, каб тэма Беларусі захоўвалася ў міжнародным парадку дня не як фармальнасць, а як пытанне свабоды, бяспекі і будучыні Еўропы.

Гэтая мэта азначае простую рэч: будучыня Беларусі не павінна вызначацца без беларусаў, а рэжым не павінен заставацца адзіным, каго ў свеце чуюць ад імя нашай краіны.

## СТРАТЭГІЧНАЯ МЭТА 5. ПАДРЫХТАВАЦЬ ДЭМАКРАТЫЧНЫ ПЕРАХОД І СФАРМІРАВАЦЬ ЯСНАЕ БАЧАННЕ НОВАЙ БЕЛАРУСІ ЯК СВАБОДНАЙ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ.

Дэмакратычныя сілы фарміруюць яснае і рэалістычнае ўяўленне пра будучыню краіны, рыхтуюць прыярытэтныя рэформы, рашэнні для пераходнага перыяду і асновы ўстойлівых дэмакратычных інстытутаў, каб у момант палітычных змен Беларусь была гатовая не толькі да перамен, але і да паслядоўнага дэмакратычнага развіцця.

Падрыхтоўка да пераходу ўключае распрацоўку першачарговых праектаў законаў, інстытуцыйных рашэнняў і пакета крокаў на першыя месяцы пасля перамен, каб акно магчымасцяў не было страчана праз непадрыхтаванасць.

Пры гэтым змест рэформаў павінен быць растлумачаны беларусам простай і зразумелай мовай: не толькі што менавіта зменіцца, але і як гэтыя змены паўплываюць на паўсядзённае жыццё, бяспеку, працу, адукацыю, справядлівасць і магчымасці для будучыні. Чым ясней грамадства разумее вобраз Новай Беларусі і практычны сэнс рэформаў, тым меншы страх перад пераменамі і тым вышэйшая гатоўнасць падтрымліваць дэмакратычны пераход.

## СТРАТЭГІЧНАЯ МЭТА 6. УМАЦАВАЦЬ ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ СІЛЫ ЯК УСТОЙЛІВУЮ СЕТКУ, ЗДОЛЬНУЮ ДЗЕЙНІЧАЦЬ РАЗАМ СТОЛЬКІ, КОЛЬКІ СПАТРЭБІЦЦА.

Дэмакратычныя сілы развіваюць свае структуры, каардынацыю, бяспеку і здольнасць да сумесных дзеянняў, каб захоўваць дзеяздольнасць ва ўмовах працяглага крызісу і быць гатовымі як да зацяжнога супрацьстаяння, так і да выкарыстання новых магчымасцяў для перамен.

Дэмакратычныя сілы — гэта не адна вертыкаль, а сетка. Таму асабліва важныя зразумелыя правілы ўзаемадзеяння, узгадненне ключавых паведамленняў, сумеснае планаванне кампаній і ўменне засяроджваць намаганні там, дзе яны даюць найбольшы эфект.

Моцны дэмакратычны рух немагчымы без людзей, якія ўмеюць дзейнічаць разам і давяраюць адзін аднаму. Таму важныя развіццё навыкаў каманд, навучанне на рэальных задачах, лічбавая бяспека, рэзервовыя каналы сувязі і абарона людзей унутры сеткі.

Не менш важна захоўваць сувязь з грамадствам унутры краіны. Для гэтага трэба падтрымліваць лакальныя ініцыятывы, культурныя, адукацыйныя, валанцёрскія і грамадскія праекты, якія робяць дэмакратычныя мэты зразумелымі і карыснымі ў паўсядзённым жыцці людзей.

Менавіта так фарміруецца ўстойлівая і жывая сетка, якая не распадаецца пад ціскам, захоўвае здольнасць да дзеяння і можа стаць апорай для будучых перамен.

# Рэсурсы і ўстойлівасць

Устойлівасць дэмакратычных сіл залежыць ад здольнасці абапірацца не на выпадковыя магчымасці, а на надзейную і прадказальную рэсурсную аснову. Наша задача — выбудаваць такую сістэму, пры якой ключавыя напрамкі працы не спыняюцца праз знешні ціск, змену палітычнай кан'юнктуры або скарачэнне донарскай увагі.

Гэтая сістэма павінна будавацца на некалькіх апорах. Першая — рэгулярная грамадская падтрымка: штомесячныя ахвяраванні і іншыя формы пастаяннага ўдзелу, якія ўмацоўваюць сувязь з грамадствам і зніжаюць залежнасць ад разавых збораў. Другая — мэтавыя кампаніі пад канкрэтныя задачы, дзе людзям зразумела, на што менавіта ідуць сродкі, у якія тэрміны і з якім вынікам. Трэцяя — доўгатэрміновыя партнёрствы са стратэгічнымі донарамі і адказнымі партнёрамі, гатовымі падтрымліваць не толькі асобныя акцыі, але і ўстойлівыя напрамкі працы.

Асаблівае значэнне мае рэзерв на надзвычайныя выпадкі. Ён патрэбны для сітуацый, калі дапамога, абарона або арганізацыйная рэакцыя патрабуюцца неадкладна. Разам з гэтым важна фарміраваць і фонд будучыні — доўгатэрміновы фінансавы рэсурс, пры якім захоўваецца сам капітал, а на бягучую працу з часам накіроўваецца даход ад яго размяшчэння. Гэта дазволіць паступова пакрываць частку пастаянных выдаткаў і менш залежаць ад новых збораў і нестабільнасці знешняга фінансавання.

Давер да такой сістэмы трымаецца на зразумелых правілах, сумленнай справаздачнасці, абароне даных і адказным расходаванні сродкаў. Пры гэтым празрыстасць не павінна аслабляць бяспеку людзей і працу адчувальных напрамкаў.

Рэсурсная ўстойлівасць — гэта не дапаможная задача, а адна з умоў палітычнай дзеяздольнасці. Чым надзейней уладкаваная сістэма падтрымкі, тым упэўненей дэмакратычныя сілы могуць дапамагаць людзям, абараняць грамадскія інтарэсы, захоўваць міжнародную прысутнасць і рыхтавацца да будучых перамен.

# Як вымяраем поспех

Поспех стратэгіі вымяраецца не колькасцю дзеянняў, а тым, наколькі яны рэальна набліжаюць нас да пастаўленых мэт. Таму мы ацэньваем не толькі тое, што зроблена, але і які вынік гэта дало і што змяняецца для людзей, грамадства і будучых перамен.

Агульная логіка ацэнкі адзіная для ўсіх напрамкаў, хоць самі спосабы вымярэння могуць адрозніваецца. Гуманітарная дапамога, міжнародная адвакатыя, інфармацыйная праца, падрыхтоўка рэформаў і арганізацыйнае развіццё патрабуюць сваіх паказчыкаў, але ў кожным выпадку важныя тры пытанні: што зроблена, які вынік атрыманы і як гэта прасоўвае нас да стратэгічнай мэты.

Для доўгатэрміновых задач асабліва важна бачыць не толькі канчатковую мэту, але і рух да яе. Дэмакратычны пераход, аслабленне рэжыму і ўмацаванне грамадскай устойлівасці патрабуюць часу, таму мы фіксуем вехі і прамежкавы прагрэс, а не толькі хуткія эфекты.

Бяспека заўсёды важнейшая за поўнасць даных. Там, дзе адкрыты збор інфармацыі можа ствараць рызыку для людзей і працы, выкарыстоўваюцца бяспечныя, зводныя і ананімныя спосабы справаздачнасці. Лепш менш даных, чым больш рызыкі для чалавека.

Ацэнка патрэбная не для самаапраўдання, а для карэкціроўкі стратэгіі. Калі нешта не працуе, мы прызнаём гэта, змяняем падыход і захоўваем фокус на тым, што сапраўды дапамагае людзям і набліжае дэмакратычныя перамены.

# Чаму гэта датычыцца кожнага

Мы жывём у момант, калі лёс Беларусі яшчэ не вырашаны канчаткова. Рэжым трымаецца на гвалце і знешняй залежнасці, але яму супрацьстаіць грамадства, якое не адмовілася ад свабоды, годнасці і права самім вызначаць будучыню сваёй краіны. Гэтая стратэгія аб'ядноўвае нашы намаганні вакол агульнай мэты: дапамагаць людзям, аслабляць дыктатуру, абараняць незалежнасць Беларусі і рыхтаваць дэмакратычныя перамены. Яна датычыцца кожнага, бо перамены пачынаюцца там, дзе людзі перастаюць чакаць і пачынаюць дзейнічаць разам.